*А.Р. МАЦЕВАСЯН*

## РАЗВІЦЦЁ САЦЫЯЛЬНЫХ ФУНКЦЫЙ БЕЛАРУСКІХ МУЗЕЯЎ

Музейныя прадметы ўтрымліваюць унікальную, сацыяльна значную інфармацыю, з’яўляюцца дакументальным пацвярджэннем пэўных з’яў і працэсаў у грамадскім жыцці і прыродзе і могуць быць крыніцай эмацыянальнага ўздзеяння на чалавека. Яны ствараюць перадумовы для выяўлення ролі, што выконвае музей з улікам патрабаванняў грамадства і чалавека. Патрабаванні да музея, якія гістарычна сфарміраваліся і адлюстроўваюць яго грамадскае прызначэнне, акрэсліваюць характар дзейнасці ў канкрэтнай сацыяльна-культурнай сітуацыі, вызначаюць сацыяльныя функцыі музея.

У якасці асноўных функцый музея вучоныя-музеязнаўцы вылучаюць функцыі дакументавання, адукацыі і выхавання [5].

*Функцыі дакументавання* выяўляюцца праз адлюстраванне ў прадметах музейных збораў аб’ектыўных працэсаў і з’яў у прыродзе і грамадскім жыцці, якія вывучае той або іншы музей у адпаведнасці са сваім месцам у музейнай сетцы і профілем. Гэтыя функцыі рэалізуецца пераважна ў працэсе захавання культурнай спадчыны, у тым ліку музейных каштоўнасцей: камплектавання фондаў, вывучэння музейных калекцый, збораў і інш.

Сутнасць дакументавання заключаецца ў тым, што музей выяўляе і збірае тыя помнікі матэрыяльнай і духоўнай культуры, якія адлюстроўваюць найбольш характэрныя і значныя падзеі ў сацыяльна-эканамічным і культурным развіцці грамадства. Акрамя гэтага, важнымі функцыямі дакументавання з’яўляюцца захаванне і падрыхтоўка помніка як для сучаснага навуковага і навукова-асветніцкага выкарыстання, так і для выкарыстання яго наступнымі пакаленнямі. Гэта задача вырашаецца шляхам выяўлення і адбору помнікаў для захавання ў музеі, а таксама сістэмай мерапрыемстваў па забеспячэнні іх фізічнай і юрыдычнай аховы (улік, вывучэнне, стварэнне неабходных умоў захавання і інш.). Зразумела, што гэта работа з’яўляецца пастаяннай, мэтанакіраванай і павінна грунтавацца на новых дасягненнях навукі з улікам практыкі музеяў.

Дакументуючы эпоху на аснове старанна выбраных помнікаў, музей стварае перадумовы для свайго далейшага развіцця і ўдасканалення. Чым вышэйшы навуковы і прафесійны ўзровень музейнага збору, тым большы грамадскі прэстыж музея, выразней акрэсліваюцца яго сацыяльныя задачы. Менавіта таму функцыі дакументавання працэсаў і з’яў грамадскага жыцця праяўляюцца ў мэтанакіраванай і планавай дзейнасці музея, якая вызначаецца навуковай метадалогіяй, дасягненнямі профільнай навукі і музеялогіі па выяўленні, збіранні, захаванні, сістэматызацыі і вывучэнні помнікаў матэрыяльнай і духоўнай культуры – музейных прадметаў.

Разглядаючы асаблівасці рэалізацыі функцый дакументавання, некаторыя даследчыкі-музеязнаўцы падкрэсліваюць, што яны абумоўлены неабходнасцю вырашэння дзвюх асноўных задач: захавання існуючага фонду музейных каштоўнасцей і пашырэння гэтага фонду [4]. Непасрэдна гэтыя задачы вырашаюцца ў такіх напрамках музейнай дзейнасці, як навуковае камплектаванне фондаў, навукова-фондавая работа, падрыхтоўка публікацый. Своеасаблівай формай публікацый музея з’яўляецца музейная экспазіцыя.

*Важныя сацыяльныя функцыі музея* — адукацыя і выхаванне. Уласцівасці музейных прадметаў: пераканаўчасць, доказнасць, нагляднасць, даступнасць, здольнасць эмацыянальна ўплываць — вызначаюць асноўныя аспекты адукацыі і выхавання ў музеі: пазнавальны, прапагандысцкі, маральна-выхаваўчы, эстэтычна-выхаваўчы.

Названая функцыя рэалізуецца ў працэсе камунікацыі ў розных формах экспазіцыйнай і навукова-асветніцкай работы музеяў. Асаблівасці рэалізацыі гэтай функцыі абумоўлены, з аднаго боку, задачамі, якія ставіць грамадства перад музеямі на пэўным этапе развіцця, з другога — зменай характару музейнай аўдыторыі і яе патрабаваннямі да музеяў.

На сучасным этапе развіцця музейнай справы асаблівая ўвага надаецца экспазіцыйнай дзейнасці. Сапраўды, у музейнай экспазіцыі перакрыжоўваюцца асноўныя функцыі музея. Менавіта экспазіцыя адлюстроўвае ўзровень музейнага дакументавання, ад якога, у сваю чаргу, залежыць якасць культурна-адукацыйнай работы. Змест і форма экспазіцыі вызначаюць шматлікія магчымасці выкарыстання музея ў адукацыі, прапагандзе, арганізацыі вольнага часу насельніцтва.

У экспазіцыйнай дзейнасці сучаснага музея назіраюцца дзве тэндэнцыі. Першая звязана з пошукамі сродкаў выразнасці дэманстрацыі музейных прадметаў, з выкарыстаннем у архітэктурна-мастацкім вырашэнні новых прыёмаў і метадаў, мадэрнізацыяй існуючых

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

экспазіцый. Другая тэндэнцыя заключаецца ў актывізацыі выставачна-экспазіцыйнай дзейнасці музеяў. Выстаўкі дазваляюць музею хутка рэагаваць на актуальныя падзеі, павялічваюць магчымасць выкарыстання фондавых калекцый. Яскравым прыкладам такой дзейнасці ў гісторыі музейнай справы Беларусі можна лічыць серыю выставак пад агульнай назвай "З невядомых калекцый музея", якія з 1994 г. праходзяць у Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны [3].

Задачы ў галіне адукацыі і выхавання вызначылі асаблівасці культурна-асветніцкай дзейнасці музея, якія перш за ўсё праяўляюцца ў пашырэнні формаў, як спецыфічных, так і нетрадыцыйных для музея. Па даных комплекснага сацыялагічнага даследавання работы музеяў Беларусі, якое было праведзена супрацоўнікамі Беларускага дзяржаўнага інстытута праблем культуры на працягу 1998—1999 гг., па-ранейшаму адной з галоўных формаў работы і сродкаў перадачы музейнай інфармацыі застаецца экскурсія. Даныя апытання сведчаць пра даволі высокую ступень задаволенасці наведвальнікаў зместам экскурсій і работай экскурсаводаў [1]. На жаль, у апошнія гады фіксуецца тэндэнцыя да зніжэння яе папулярнасці сярод значнай часткі наведвальнікаў (асабліва з ліку пастаяннай аўдыторыі). Новыя тэндэнцыі ў такой традыцыйнай форме музейнага абслугоўвання, як экскурсія, звязаны са зменай патрабаванняў наведвальнікаў.

Яшчэ дзесяцігоддзе таму музейна-педагагічныя заняткі як форма культурна-асветніцкай работы адсутнічалі ў практыцы работы беларускіх музеяў (за выключэннем гісторыка-культурнага запаведніка "Заслаўе", дзе такія заняткі праводзіліся з 1989 г.). Сёння гэта форма існуе і развіваецца ў шэрагу музеяў: Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь, Нацыянальны музей гісторыі і культуры Беларусі, Магілёўскі абласны краязнаўчы музей, Браслаўскае раённае аб'яднанне музеяў, Гродзенскі дзяржаўны гісторыка-археалагічны музей і інш.

На сучасным этапе асаблівае значэнне набывае яшчэ адна сацыяльная функцыя музея – *рэкрэацыйная.* Яна звязана з выкарыстаннем музея для культурнага адпачынку і арганізацыі вольнага часу насельніцтва. Яшчэ два дзесяцігоддзі назад некаторыя тэарэтыкі і практыкі музейнай справы аспрэчвалі ролю названай функцыі, але сёння большасць беларускіх, расійскіх і замежных спецыялістаў у сферы музеяў вызначаюць яе як перспектыўную [2].

Рэалізуецца рэкрэацыйная функцыя ў трох асноўных кірунках. Першы – задавальненне пазнавальна-рэкрэацыйных патрэбнасцей насельніцтва, якое ажыццяўляецца ў традыцыйных і нетрадыцыйных формах навукова-асветніцкай дзейнасці музея. Другі кірунак, больш традыцыйны, звязаны з эмацыянальным і эстэтычным уздзеяннем на чалавека музейных прадметаў. Пададзеныя ў экспазіцыі на навуковай аснове і ў адпаведнасці з сучаснымі эстэтычнымі крытэрыямі музейныя прадметы могуць ствараць умовы для эмацыянальнай разрадкі, аднаўлення духоўных і фізічных сіл чалавека. Сацыялагічнае даследаванне паказвае, што асноўнымі матывамі наведвання музея для навучэнцаў (45,7% наведвальнікаў ад агульнай колькасці) з'яўляюцца пазнавальны і рэкрэацыйны. Значная частка апытаных арыентуецца на музей пераважна як на месца рэкрэацыі і крыніцу ўздзеяння на свой эмацыянальны і духоўны свет. Матыў вольнага часу, адпачынку адзначылі 21,5% рэспандэнтаў, эстэтычны 15,8%. У старшым узросце ўдзельная вага гэтых матываў, асабліва эстэтычнага, узрастае [1].

І, нарэшце, трэці кірунак, які раней непасрэдна не звязваўся з музеямі, –гэта значэнне музея як месца зносін у вольны час. Музей здольны аб'яднаць вакол сябе людзей, у якіх агульны інтарэс да пэўнай гістарычнай, культурнай, прыродазнаўчай тэматыкі, далучаючы іх да творчай музейнай работы і ствараючы ўмовы для культурных зносін.

Гісторыя развіцця музейнай справы паказвае, што ў канкрэтнай сацыяльна-культурнай сітуацыі той ці іншы аспект сацыяльных функцый можа выходзіць на першы план.

У дарэвалюцыйнай Расіі першыя публічныя музеі выкарыстоўвалі навуковыя калекцыі для агляду ў выхадныя дні з мэтай адукацыі народных мас. Аналагічную карціну мы назіраем і ў дакастрычніцкай Беларусі. Тэндэнцыя да асэнсавання музейных прадметаў як навуковых першакрыніц, а таксама імкненне надаць ім камунікатыўны характар паспрыялі адкрыццю шэрага калекцый для вольнага агляду. Менавіта ў гэты час можна "канстатаваць пачатак асэнсаванага, мэтанакіраванага вывучэння і калекцыяніравання беларускіх матэрыялаў, што аб'ектыўна прыводзіла да прызнання права беларусаў на іх самастойнае выкарыстанне" (Гужалоўскі А.А. Нараджэнне беларускага музея. — Мн., 2001. — С. 106). Адначасова замацаваўся падыход да музея як да культурна-асветніцкай установы, якая займае значнае месца ў сістэме пазашкольнай адукацыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У Савецкай дзяржаве музеі былі не толькі цэнтрамі маральнага, эстэтычнага, патрыятычнага выхавання, але і ідэалагічнымі цэнтрамі. Грамадства па- трабавала ад музеяў рэалізацыі ўсіх тых палітычных, ідэалагічных, культурных, выхаваўчых магчымасцей, якімі валодаюць помнікі матэрыяльнай і духоўнай культуры. І хаця з пачатку 60-х гг. XX ст. у савецкім музейным будаўніцтве была ўстаноўка на раўнамернае і паслядоўнае ажыццяўленне музеямі функцый дакументавання, адукацыі і выхавання, перакос яўна адбываўся ў бок апошняй.

Пытанне аб сацыяльных функцыях музея заставалася цэнтральным у савецкім музеязнаўстве да канца існавання Савецкай дзяржавы. У гэтым выявіліся, з аднаго боку, "пэўная агрэсіўнасць сацыялагічных ведаў, з другога — імкненне ўвесці музейную дзейнасць у строгія рамкі. Функцыі адукацыі і выхавання і дакументавання навязваліся музею зверху, успрымаліся як частка грамадскага жыцця, за якую ён павінен несці адказнасць" [2]. Устаноўка на сацыяльныя функцыі азначала ператварэнне музея ў частку дзяржаўнай машыны. Сапраўдныя сувязі музея і грамадства пры гэтым ігнараваліся, у ацэнцы музеяў зыходзілі не з іх рэальных магчымасцей, а з задач іх выкарыстання ў якасці сродкаў прапаганды і ідэалогіі. Музей заўсёды быў правадніком культурных і ідэалагічных установак улады.

Сітуацыя змянілася пасля набыцця Рэспублікай Беларусь незалежнасці. Адбылася пераацэнка прыярытэтаў і каштоўнасцей у грамадстве, у тым ліку і ў музеях. Фарміраванне нацыянальнага музейнага фонду, зберажэнне калекцый, вывучэнне нацыянальных помнікаў гісторыі і культуры, афармленне экспазіцый і выставак, папулярызацыя нацыянальнай культурнай спадчыны – вось тыя задачы, якія сёння стаяць перад беларускімі музеямі. Менавіта гэтыя задачы патрабуюць выхаду музея з былых межаў культурна-асветніцкіх устаноў. Музеі пашыраюць сферу свайго ўплыву. Гэта праяўляецца як у колькасным росце музеяў, так і ў разнастайнасці музейных формаў. За гады існавання незалежнай Беларусі ў рэспубліцы з'явіўся 21 музей. За гэты ж час створаны новыя тыпы музеяў, такія як музеі-запаведнікі, экамузеі, аб'ядналыя музеі, культурныя цэнтры і інш.

З'яўляюцца новыя музейныя праекты, якія выходзяць за музейныя рамкі і ахопліваюць іншыя сацыяльныя інстытуты, пашыраючы тым самым сваю рэальную і патэнцыяльную аўдыторыю. Акрэсліваецца тэндэнцыя беларускіх музеяў да аднаўлення іх у статусе навукова-даследчай установы, які быў страчаны за гады існавання ў таталітарнай дзяржаве.

Сёння мы ўпэўненыя ў тым, што сучасны музей павінен быць не толькі сховішчам культурных каштоўнасцей, а перш за ўсё месцам культурнай камунікацыі. Па меркаванні спецыялістаў, сёння музей трактуецца «як пасрэднік паміж грамадствам і яго культурай, як асобы "механізм", што забяспечвае грамадства спецыфічнай інфармацыяй, як інфармацыйна-камунікатыўная сістэма, якая ўяўляе адначасова асобы сродак здабывання інфармацыі, што ўтрымліваецца ў грамадскіх формах мінулай і сучаснай культуры, і "ўстройства" па захаванні, перапрацоўцы і выдачы гэтай інфармацыі спажыўцу» (гл.: Музееведение. Проблемы культурной коммуникации в музейной деятельности: Сб. науч. тр. / НИИ культуры. — М., 1989. — С. 4.).

Сучаснае грамадства прад'яўляе да музеяў высокія патрабаванні, і музеі неадкладна рэагуюць на змены, якія адбываюцца ў грамадстве, звязаныя з агульнымі тэндэнцыямі ў сферы навукі, культуры, грамадства. Сёння асноўная функцыя беларускіх музеяў, як і сусветнай музейнай супольнасці, – зрабіць музейную інфармацыю, заключаную ў помніках гісторыі і культуры, даступнай як мага больш шырокаму колу наведвальнікаў, а самі музеі — сацыяльна значным грамадскім інстытутам.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1. *Алейнікаў С.М.* Краязнаўчы музей і моладзь // Комплекснае сацыялагічнае даследаванне работы музеяў Беларусі з аўдыторыяй // Аператыўная інфармацыя па праблемах культуры і мастацтва: Навукова-інфарм. зб. Вып. 1 / Нац. б-ка Беларусі. – Мн., 2000.– 108 с.

2. *Вансловa Е.Г., Гнедовский М.Б. и др.* Социальные функции музея: споры о будущем // Музееведение. На пути к музею XXI века: Сб. науч. тр./ НИИ культуры. – М., 1989. – С. 186–204.

3. *Воронкова И.Ю.* Экспозиционная работа Белорусского государственного музея истории Великой Отечественной войны. Традиции, современность, перспективы // Аператыўная інфармацыя па праблемах культуры і мастацтва: Навукова-інфарм. зб. Вып. 5 / Нац. б-ка Беларусі. – Мн., 2000. – С.11–21.

4. *Равикович Д.А.* Социальные функции и типология музеев // Музееведение. Вопросы теории и методики: Сб науч. тр. / НИИ культуры. — М., 1987. – С.10 – 24.

5. *Равикович Д.А.* Социальные функции музея // Российская музейная энциклопедия. – М.: Прогресс; «РИПОЛ Классик», 2001. — Т. 2. — С. 201.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ